Цэнтральнай плошчы ў Рудзенску ў класічным разуменні быццам бы і няма. Але цэнтр гарадскога пасёлка прыкметна абазначаны. Ладны сквер. Па баках выканкам, Дом культуры, сцены заводскіх карпусоў "Святлатэхнікі", касцёл, будучы праваслаўны храм, зеўрае пустымі аконнымі праёмамі будынак палікінікі. Летам мінулага года адзін з нас фатаграфаў помнік Леніну ў скверы. Звычайны, стандартна-каменны Ільіч. У колішнія часы стаяў тут і каменны Сталін. Але ягоную скульптуру зрынулі з п'едэстала і некуды звезлі. Фатаграфуючы летась помнік Леніну, ці ж можна было прагназаваць, што і ён будзе хутка звалены з п'едэстала? Хаця Беларусь змірылася з велізарнай колькасцю ідалаў на плошчах сваіх гарадоў і пасёлкаў.

Калі бетонную глыбу-калону, на якой месцілася выява Сталіна, пакінулі на месцы, знайшлі ёй іншае прызначэнне. Да яе прымацавалі шыльду з надпісам аб часе заснавання Рудзенска. Праўда, спалучэнне колеру і тэкстуры пліты з фарбаю літар такое няўдалае, што дакладна прачытаць высечанае на камені немагчыма ні ў акулярах, ні без іх.

П'едэстал, на якім дзесяцігоддзі прастаяў каменны Ленін, зруйнавалі ўшчэнт. На тым месцы, дзе знаходзіўся помнік, і на дарожцы, што вяла да яго, кучкі камянёў.

Мясцовыя жыхары распавялі, што ліквідацыя помніка правадыру-бальшавіку прайшла ціха, выбралі такі час, калі на вуліцы нікога не было. Ніхто нічога не заўважыў. Абышліся без цырыманіяў. Потым высветлілася, што скульптура Уладзіміра Ільіча апынулася на гаспадарчым двары былога саўгаса "Рудзенскі", цяпер гэта гаспадарка належыць "Мінскметрабуду". Стаіць ён там у поўны рост, на зямлі, без п'едэстала. Як быццам нечага чакае.

Рудзенск застаўся фактычна без помнікаў асобам. Хаця назвы вуліц тут вытрыманы ў савецкім стылі: Савецкая, Ленінская, Камсамольская, Інтэрнацыянальная, Луначарскага, Карла Маркса, Энгельса... Праўда, гадоў дзесяць таму з'явілася вуліца Міхася Чарота, паэта, драматурга, грамадскага дзеяча, ураджэнца Рудзенска.

*Я шумлівы чарот, я мяцежны бунтар.*
*Я балота буджу гучным шумам.*
*У вадзе я жыву і абмыт дажджом хмар,*
*Але змоўкнуць не дам сваім струнам.*
*Уздыму дух людзей, прабуджу іх ад сну, –*
*Слаўу, будучнасць я ім прарочу...*
*Я, мяцежны бунтар, клічу жыцця вясну,*
*Клічу к працы свабоднай і творчай.*

Міхась Чарот (Кудзелька) у 1930-я гады перастаў займацца літаратурай, рэдагаваў газету, асуджаў сваіх былых паплечнікаў за нацыянал-дэмакратызм. Але гэтыя абставіны не перашкодзілі арышту былога паэта-бунтара, ён быў расстраляны за "контррэвалюцыйную нацыянал-дэмакратычную дзейнасць" у студзені 1937 года. У 1956 годзе Міхаіл Сымонавіч Кудзелька быў рэабілітаваны.

На будынку Дома культуры ў Рудзенску прымацавана мемарыяльная дошка.

**Мікалай ДЫМ, Мікалай ЗЕНЕВІЧ.**

*(Працяг у наступным нумары.)*

ТОЧКА ЗРЕНИЯ



Александр ФЕДУТА

# Яйца в разных корзинах

Самая неожиданная для автора этих строк новость прошедшей недели пришла в воскресенье. Президент Российской Федерации провел день на горнолыжном курорте недалеко от Алматы – вместе с казахстанским елбасы. Визит приурочен к 25-летию установления дипломатических отношений с Казахстаном.

Собственно говоря, череда дипломатических юбилеев сейчас покатится нам навстречу с телевизионных экранов. Это не удивляет. Да и алматинский горный курорт хорошо знаком всем, так что понятно, почему, выбирая между Алматы и Сочи, Путин выбрал Алматы.

Не Логойск выбрал.

Дважды начиная с 2014-го года Владимир Путин публично корректировал свое отношение к ближайшим союзникам. Первый раз – когда идея четырехсторонних переговоров по донбасскому конфликту, формат которой был предложен Европе Нурсултаном Назарбаевым, доверена была к реализации Александру Лукашенко. Тогда, вероятно, глава российского государства счел, что Назарбаев слишком самостоятелен в своей политике, чтобы предоставлять ему возможность общаться с лидерами Германии и Франции несколько чаще обычного.

Сейчас встрече с Александром Лукашенко Путин демонстративно предпочел катание на лыжах в компании Нурсултана Назарбаева. Это было не оскорбительно формально: поездка белорусского президента в Сочи изначально публично трактовалась пресс-службой Кремля как поездка частного лица. Но по сути, конечно, оскорбление было нанесено. В преддверии юбилея установления дипломатических отношений можно было найти двадцать минут для протокольного позирования перед телекамерами.

Я не уверен в том, что продекларированная подготовка к заседанию Высшего государственного совета дышащего на ладан Союзного государства будет ускорена. Очевидно, что состояться она должна не позднее марта – в конце концов, любой бухгалтер скажет, когда у нас окончание финансового года и дирекция предприятия должна отчитываться перед учредителями. Я не бухгалтер, но, по-моему, как раз в марте. И именно в марте, после утверждения доходно-расходной части отчета дирекции, учредители должны сказать всем публично, как дальше будет развиваться предприятие. И с этой точки зрения Союзное государство ничуть не лучше и не хуже любой частной лавочки. Шуму несколько больше, правда, но в последнее время стих и он.

Почему? Потому что учредители достаточно явно раскладывают яйца по разным корзинам, чтобы при столкновении не проверять друг друга на прочность. Сейчас же всего лишь публично продемонстрировано, что яиц в общей корзине практически не осталось. И визитом в Казахстан, а затем в Таджикистан и Кыргызстан Путин демонстрирует вектор развития созданного им Евразийского союза. Беларусь решила отдалиться от него? Отдаляйтесь. Но не надейтесь, что глава вашего государства и далее будет восприниматься и в качестве частного лица. Как частное лицо – нет. Катайтесь на лыжах в одиночестве. Как президент – конечно да, куда же без этого? Все вполне официально.

Я бы не рассматривал это как очередную форму давления. В конце концов товарооборот уменьшается, и российские производители, насколько можно судить, используют это для постепенного отвоевывания плацдармов, завоеванных белорусскими поставщиками на их территории при неимоверных лоббистских усилиях Александра Лукашенко. Что, творог и сметану в России разучились производить? Нет, не разучились. Вот сейчас и того больше производят. При чем тут Данкверт и его злая воля? Кто вообще он, этот Данкверт? Зажимают белорусского производителя – освобождают место российскому. Все логично.

Проблема в том, что такое поведение российского союзника можно и нужно было предвидеть. Российский рынок не будет вечно льготным для нас. Это противоречит и законам экономики, и здравому смыслу. Как и российские поставки в Беларусь не могут бесконечно льготироваться на основании договоренностей между двумя президентами. Не будет этого. Советский Союз некогда сдал Эриха Хоннекера – неужели в Минске кто-то думал, что правопреемница СССР никогда не сдаст Лукашенко? Я не говорю – «не выдаст», ибо выдавать некому, никто не требует. Но вот сдать с потрохами белорусскую экономическую модель Россия может. Она уже это сделала. Петляние на лыжах по алматинским горным склонам – это как извилистый росчерк президента России после страшных слов новой резолюции:

– На общих основаниях.

То, что сегодня промидовские политологи выдают за изощренную форму давления на Беларусь со стороны Кремля, всего лишь переход на общение Москвы и Минска на общих основаниях.

В общем, хотя наши яйца и в разных корзинах, но, похоже, они дали трещину. Причем белорусские – не российские. У тех скорлупа, судя по всему, несколько прочнее.

УЧОРА

# Сяргей Мураўёў на волі

Учора кіраўніка кампаніі «РасінтэхГруп» Сяргея Мураўёва вызвалілі з-пад варты непасрэдна ў зале суда. Ён прызнаны вінаватым ва ўхіленні ад выплаты падаткаў і прыгавораны да двух з паловай гадоў абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову, але паколькі бізнесмен знаходзіўся за кратамі з 3 чэрвеня 2015 года, то суд прызнаў пакаранне адбытым.

Сяргей Мураўёў поўнасцю прызнаў сваю віну. Ён цалкам кампенсаваў шкоду дзяржаве. Пры гэтым маёмасць Сяргея Мураўёва будзе канфіскавана – два зямельныя ўчасткі і два дамы ў Мінскай вобласці, а таксама аўтамабіль «Пежо».

Хоць прыгавор суда не набыў законную сілу, але, думаецца, Сяргей Мураўёў не будзе яго абскарджваць.

**Пётр СКВАРЧЭЎСКІ.**

ІНІЦЫЯТЫВА

# Дармаед? На адпачынак у Егіпет!

*З незвычайнай прапановай выступіла адна беларуская турфірма.*

Кампанія "Мерлінтур" накіравала ліст у Міністэрства па падатках і зборах, у якім прапануе арганізаваць для плацельшчыкаў падатку на "дармаедства" розыгрыш пуцёўкі ў Егіпет. Асабліва падкрэсліваецца, што турфірма поўнасцю аплаціць такое падарожжа, уключаючы пералёт і пражыванне ў гатэлі па сістэме "ўсё ўключана".

– Мяркуем, што "сацыяльныя ўтрыманцы" больш ахвотна плацілі б падатак, калі б ведалі, што пры гэтым могуць для сябе нешта і выйграць, – дадаў "Народнай Волі" камерцыйны дырэктар кампаніі **Канстанцін КАЛЯДА**. – Добра, каб і іншыя падхапілі нашу ініцыятыву. Няхай бы, напрыклад, Клімавіцкі лікёра-гарэлачны завод ад сябе таксама прапанаваў нейкія прызы для "дармаедаў". Трэба талакой такія справы вырашаць. Тады будзе ўсім і добра, і весела. І не будзе канфрантацый.

**Алесь СВЯТЛАНІЧ.**

ПРАПАНОВА

# Узвядзём помнік Тызенгаўзу!

Пішу Вам я, жыхар горада Паставы, што знаходзіцца на паўночным захадзе нашай Белай Русі, у краі так званага Паазер'я. Вельмі люблю свой горад, сваю родную старонку, але многае з таго, што робіцца ў нас у апошнія гады, часам выклікае абурэнне!

Даўно надышоў час аддаць даніну павагі тым, хто палажыў нямала цаглін у падмуркі нашага горада. У першую чаргу я маю на ўвазе Антонія Тызенгаўза. Калі б не гэтая гістарычная асоба, дык ці ведаў бы хто зараз пра Паставы?

На цэнтральнай плошчы ўзвышаецца помнік У.І.Леніну. А што зрабіў "правадыр усіх працоўных" для нашага горада? За яго фантомныя ідэі мясцовыя жыхары заплацілі крывёю. Падчас бальшавіцкага тэрору знішчаны лепшыя прадстаўнікі нашага люду.

Я звярнуўся да мясцовых улад з прапановай устанавіць у горадзе помнік А.Тызенгаўзу, які разам са сваім родам пакінуў вялікую спадчыну на нашай зямлі. Ёсць усе падставы для таго, каб мая ініцыятыва была падтрымана. Нават куцае апытанне, праведзенае на сайце райвыканкама, паказала, што са 100 чалавек 85 за тое, каб з'явіўся такі помнік у цэнтры Пастаў. Трэба толькі знайсці сродкі, аб'явіць конкурс на лепшы яго варыянт – і ўзвесці. Замест канкрэтных крокаў у гэтым накірунку чыноўнікі даюць адказ: у раённым бюджэце няма грошай на такі праект.

Што і казаць, самая звычайная адпіска. Калі б у кіраўніцтва райвыканкама была зацікаўленасць у рэалізацыі маёй прапановы, якая падтрымліваецца большасцю гараджан, яно папрасіла б усё мясцовае насельніцтва зрабіць унёсак ва ўзвядзенне помніка Тызенгаўзу. Я ўпэўнены, многія адгукнуліся б і агульнымі намаганнямі была б аддадзена даніна павагі славутаму прародзічу, які вельмі многае зрабіў для нашай зямлі, для нашай гісторыі.

Са зваротам да землякоў наконт ушанавання памяці А.Тызенгаўза я хацеў выступіць на старонках раённай газеты. Ды дзе там! Як сказала мне галоўны рэдактар Фаіна Касаткіна, начальніца ідэалагічнага аддзела райвыканкама Чаплінская лічыць, што гэтае пытанне зараз не актуальна.

Вось так – не актуальна. А што актуальна – кланяцца ідалам, ушаноўваць імёны тых, хто загубіў мільёны жыццяў?

Не, помнік Тызенгаўзу ў Паставах павінен быць узведзены! Таму я звяртаюся да мясцовай грамадскасці: давайце агульнымі намаганнямі рэалізуем вельмі важны для нашага горада, для нашага краю праект! Мы ўсе – гаспадары на роднай зямлі, а не купка чыноўнікаў.

**Сцяпан КАТОВІЧ, жыхар Пастаў.**


СТОП-КАДР



**На «Мінскай лыжні-2017», якая прайшла ў мінулыя выхадныя, 87-гадовы Мікалай Аляксеевіч Захарчанка быў адным з самых сталых удзельнікаў забегу.**

ПИСЬМО В РЕДАКЦИЮ

# Почему мне не верят?



На Ваше заявление от 30.03.90г.

АРХИВНАЯ СПРАВКА

В документах архива в деле за 1941–1943г.г. имеется список больных подследственной тюрьмы в г.Минске, в котором значится САВИЧ Иосиф (отчество не указано).

Основание: ф.394, оп.I, д.Iа, л.I3.

Печать учреждения выдавшего документ

Директор архива [подпись] В.Д.Селеменев

Зав. отделом [подпись] Н.А.Редкозубова

Уважаемая редакция!

К своему письму я прилагаю архивную справку, которая была выдана мне еще в 1990 году. Напечатайте ее, пожалуйста. Этот документ имеет прямое отношение к моей просьбе.

Вот уже много лет я веду переписку с различными государственными органами. А толку-то никакого. Никак не могу добиться получения статуса участника партизанского движения.

Во время войны я распространял подпольную литературу в Минске, добывал сведения о фашистском режиме для партизанского отряда. В один из дней оказался в гитлеровских застенках – за то, что не выдал человека, связанного с патриотической группой. В результате пыток попал в немецкую тюремную больницу, что подтверждается этой архивной справкой.

В 2011 году в газете «Во славу Родины», которая является официальным органом Министерства обороны Республики Беларусь, была напечатана статья «Мальчишка с ранцем за плечами» – обо мне и о моей борьбе с фашистами.

Спросите, так почему меня не признают участником партизанского движения? Из-за бюрократических проволочек. Бывший заместитель председателя Логойского райисполкома С.П.Кулинкович и другие чиновники направили мои документы в комиссию при Совете министров. Затем они попали в Минский горисполком, где указали, что решение о моем участии в качестве связного партизанского отряда «Большевик» должна все же принимать комиссия при том же Логойском райисполкоме.

Как видите, прогнали по кругу, и я ничего не добился. Более того, чиновники поменялись, и я теперь не могу найти оригиналы свидетельских показаний, которые представлял в комиссию Логойского райисполкома, их, видимо, случайно уничтожили.

Генерал Е.В.Микульчик, который одно время занимался вопросами бывших подпольщиков и партизан, направил меня в Минский городской Совет депутатов. Там рассмотрели мое заявление и посоветовали обратиться в Министерство обороны Республики Беларусь, откуда я получил ответ, что данная проблема не относится к их компетенции.

Замкнутый круг. Буду обращаться в прокуратуру г.Минска и требовать, чтобы ее работники разобрались в волоките конкретных чиновников. И, понятно, наказали тех, по чьей вине пропали оригиналы свидетельских показаний партизан бригады «Большевик». Свидетель Н.А.Зимницкий входил в бригаду «Большевик» с 1942-го по июль 1944 года.

**Иосиф Александрович САВИЧ, житель Минска.**

НЕЗАШОРАНЫМ ВОКАМ

# Страусіны парламент

Прыгадваю канец жніўня 1990 года. Адбываецца чарговае пасяджэнне Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і захаванні гістарычна-культурнай спадчыны Вярхоўнага Савета 12-га склікання на чале з незабыўным Паэтам і Грамадзянінам Нілам Сымонавічам Гілевічам. Камісія аднагалосна вырашае, што рэалізацыя прынятага яшчэ папярэднім складам Вярхоўнага Савета "Закона аб мовах у Беларускай ССР" патрабуе больш пільнага парламенцкага кантролю з боку новаабраных дэпутатаў.

Ніл Сымонавіч праз Прэзідыум Вярхоўнага Савета арганізуе камандзіроўку парламентарыяў у восем загадзя вызначаных раёнаў цэнтральнай і заходняй Беларусі. Са спецзаданнем адпраўляемся я і намеснік старшыні камісіі, адказны за пытанні адукацыі Яўген Цумараў. Узгоднены графік сустрэч з кіраўнікамі аддзелаў адукацыі ці іх намеснікамі ва ўсіх васьмі раённых цэнтрах.

Першыя паводле графіка – Баранавічы. У будынку мясцовага гарвыканкама нас прымае спадар Леанід Цупрык, загадчык гарадскога аддзела адукацыі. Малады (на той час 35-гадовы) энергічны чалавек, добра гаворыць па-беларуску, а галоўнае, па-дзелавому, канкрэтна дакладае пра колькасць класаў і школ з беларускай мовай навучання, якія павінны быць створаны ў Баранавічах у гэты і наступныя чатыры гады; пра перспектывы стварэння беларускамоўных гімназіі і ліцэя.

– А як у вас з кадрамі? Ці справіцеся? Як з забеспячэннем падручнікамі? – пытаюся я.

– Істотных праблем няма, – адказвае Леанід Аляксандравіч. – Настаўніцы, жонкі прыбыўшых з іншых рэспублік Савецкага Саюза ваеннаслужачых, будуць працаваць у рускамоўных школах: працоўных месцаў для іх хопіць. А настаўнікі-беларусы амаль усе некалі вучыліся ў беларускамоўных вясковых школах, дый потым ва ўніверсітэтах і педінстытутах мову ўсё-ткі вывучалі. Што да падручнікаў, то разлічваем, калі што, на дапамогу Мінска.

Мы з Яўгенам Цумаравым абяцаем, што гэтае пытанне будзе вырашана (так яно пазней і сталася), і, задаволеныя змястоўнай гутаркай, адпраўляемся далей па нашым маршруце…

Доўгія гады ў нас з Леанідам Цупрыкам ніякіх непасрэдных кантактаў не было. Аж да нядаўняга часу. Тры тыдні таму мы з калегамі-настаўнікамі, сябрамі ГА "Таварыства беларускай мовы", накіравалі ў Палату прадстаўнікоў пісьмовы зварот, у якім задалі простае пытанне: калі ж нарэшце гэтая ўстанова, якая называе сябе "парламентам", "заканадаўчым органам", пачне прымаць свае акты на дзвюх дзяржаўных мовах, якімі, згодна з дзейнай Канстытуцыяй, ёсць беларуская (стаіць на першым месцы!) і руская?

Адказ прыйшоў 15 лютага на маё імя, і пад ім стаяў подпіс: **"Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Л.А.Цупрык".** І што ж напісаў у сваім адказе мой знаёмец з 1990 года? Па сутнасці, я ўбачыў звычайную адпіску, у якой ішлі адна за адной спасылкі на Канстытуцыю, заканадаўчыя акты, указы прэзідэнта, а высновa была прывычная: "…*не бачым парушэнняў моўных правоў грамадзян у дадзенай сферы*". Удумайцеся: нават паводле вынікаў апошняга перапісу насельніцтва Беларусі паўтара мільёна яе грамадзян пацвердзілі, што карыстаюцца ў штодзённым жыцці беларускай мовай, а каля пяці мільёнаў назвалі гэтую мову роднай – і яны не могуць прачытаць законаў сваёй краіны на гэтай мове!

Мне нехта скажа: маўляў, а навошта? Газетная плошча не дазваляе напісаць на гэтую тэму зашмат. Проста звярнуся да прыкладу трох дзяржаў з абсалютна розных рэгіёнаў Еўропы. У Ірландскай Рэспубліцы, згодна з Канстытуцыяй і законам, прынятым у 2006 годзе, "*акты Парламента з'яўляюцца першаснай крыніцай заканадаўства побач з Канстытуцыяй. Пачынаючы з 14 ліпеня 2006 года, усе Акты павінны друкавацца і публікавацца адначасова на абедзвюх дзяржаўных мовах* (ірландскай і англійскай. – **Л.Б.**)". Пры гэтым, паводле афіцыйных звестак, толькі недзе 15% насельніцтва гэтай краіны без праблем разумее ірландскую мову.

У недалёкай ад нас Фінляндыі шведскую мову актыўна ўжываюць 5% ад агульнай колькасці насельніцтва. Між тым у артыкуле 51, пункце 2 Канстытуцыі Рэспублікі Фінляндыя, прынятай у 2000 годзе, чытаем: "*Урад і іншыя органы ўлады павінны падаваць на разгляд Парламента ўсе дакументы як на фінскай, так і на шведскай мовах. Аналагічным чынам адказы парламентарыяў, іх ліставанне, справаздачы і пастановы, рашэнні камітэтаў, таксама як і прапановы Рады спікераў, павінны афармляцца на фінскай і шведскай мовах*".

У Босніі і Герцагавіне афіцыйна прызнаны тры дзяржаўныя мовы – вельмі падобныя адна да адной: баснійская, сербская і харвацкая. Дык вось, Парламенцкая скупшчына гэтай федэратыўнай дзяржавы прымае ўсе свае акты на кожнай з гэтых моў – хоць, як мне казаў, знаёмы літаратурны перакладчык-басніец, "на дваццаці старонках публікаванага на кожнай мове закона могуць сустрэцца толькі два-тры адрозныя словы"! Зрэшты, чытачы "Народнай Волі" могуць пераканацца ў гэтым, зазірнуўшы на афіцыйны парламенцкі сайт Босніі і Герцагавіны (http://www.parlament.ba/?lang=hr).

Хтосьці ў Беларусі скажа: маўляў, ну гэтак у нашай краіне яно склалася, такая традыцыя… Няпраўда! Мае калегі па тым самым Вярхоўным Савеце 12-га склікання могуць пацвердзіць: абсалютная большасць законаў, якія прымаў той парламент, публікавалася па-беларуску, а асабліва ў апошнія гады яго дзейнасці на гэтай мове таксама прадстаўлялася і прымалася.

Не ведаю людзей у Беларусі, якія б не зразумелі сёння такой відавочнай рэчы, што ў дзяржаве з назвай "Беларусь" павінны існаваць усе заканадаўчыя акты на мове тытульнай нацыі. У чым жа прычына такой упартасці, страусіных паводзін сённяшніх "палатачнікаў"? Не хочацца так думаць, але… ці не Масква-матухна за гэтым стаіць?.. І ці не вінаватае тут тое спецыфічнае месца, якое займае "Нацыянальны сход" у сістэме ўлады сённяшняй Беларусі?

**Лявон БАРШЧЭЎСКІ, дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 12-га склікання**

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ

# Абавязкаў тлумных многа ёсць, на жаль, у педагога

*Школьных педагогаў абавязалі нагадваць бацькам сваіх вучняў, што яны не аплачваюць "камуналку".*

Мікола лаяў сына Мішку,
Бо дрэнна вучыцца хлапчук:
– Усе другія дзеці кніжку
Амаль не выпускаюць з рук,
І толькі ты адзін са школы
Прыносіш двойкі і калы.
Дык падстаўляй азадак голы,
Вучыцьму я, гаўнюк малы!
І праз азадак бацька Мішку,
Як кажуць, устаўляў мазгі.
Бывала, захапляўся крышку,
І тыдзень тлелі пісагі.
Ды не было з таго карысці –
Ніколі не прыносіў пяць.
Відаць,
Яго яшчэ ў калысцы
Была патрэба лупцаваць.
Мікола не хадзіў на сходы
У школу з першага званка.
Ён жонку выпраўляў заўсёды,
Каб чырванела з-за сынка.
У жонкі на заводзе праца.
Прыйшла праверка на завод,
І давялося затрымацца.
А тут якраз бацькоўскі сход.
Міколу беднаму міжволі
Пайсці прыйшлося.
Думаў ён,
Што атрымае ўзбучку ў школе,
Бо сын – аболтус, ахламон.
Хто вінаваты? Бацька й маці!
Няёмка кожнаму, дальбог,
Як пачынае сарамаціць
За дзетак школьны педагог.
Бацькоў на сход прыйшло нямала,
І большыня – для пахвалы.
Настаўніца прапанавала
Ім сесці за "свае" сталы.
Мікола блытаўся ў праходзе:
А дзе ж сядзіць ягоны сын?
(Сярод бацькоў – ну смех дый годзе! –
Такі няўцямны ён адзін.)
Хтось даў падказку, што "камчатку" –
Апошні стол – хлапец абраў.
Бацькам настаўніца спачатку
Наконт надзённых школьных спраў
Паскардзілася-расказала:
– Рамонт зрабіць бы хоць які,
А грошай у бюджэце мала.
Дык трэба скінуцца, бацькі…
А потым бітую гадзіну
Вучылка пудрыла мазгі
(І ўсе бацькі даліся дзіву)
Пра камунальныя даўгі.
Маўляў, ёсць сярод вас такія,
Што ігнаруюць плацяжы.
І хоць ты іх прыспешвай кіем
Або ў міліцыю бяжы.
Таму, маўляў, у іх і дзеткі
У школе не хапаюць зор.
Ці ж безадказны бацька гэткі
Дзіцёнку будзе як узор?
Дзяржаве ставіць палкі ў колы –
Не папаўняецца казна.
І першым прозвішча Міколы
Усім агучыла яна.
Такую адчуваў стыдобу,
Як быццам ён – Сусвету зло.
А каб абмеркаваць вучобу,
Ужо і часу не было…

* * *

Дадому ідучы, Мікола
Скіроўваў позірк свой у дол,
Бо адчуванне, што са школы
Нясе ён, як і Мішка, кол…

ПЫТАННЕ – АДКАЗ

# Што такое «пятая калона»?

*Патлумачце мне, калі ласка, што такое "пятая калона", аб якой раз-пораз паўтарае Аляксандр Лукашэнка?*

***Марыя Мікалаеўна Парнак, Мінск.***

Шаноўная Марыя Мікалаеўна! Азначэнне "пятая калона" паходзіць з часоў грамадзянскай вайны ў Іспаніі (1936–1939 гг.). Першы раз яго ўжыў у 1936 годзе франкісцкі генерал Эміліа Мола, які, выступаючы па радыё, сказаў, што, акрамя чатырох калон войскаў генерала Франка, што наступаюць на Мадрыд, у самім горадзе ёсць яшчэ і пятая калона – гэта значыць, прыхільнікі франкістаў у сталіцы. У самім войску Франка гэтае выказванне востра крытыкавалі. У адказ на прамову Мола ў арміі рэспубліканцаў быў сфарміраваны Пяты полк, які зрабіўся своеасаблівым контрсімвалам. Фразеалагізм "пятая калона" любяць ужываць рознага кшталту палітыкі, калі хочуць давесці, нібыта іх палітычныя праціўнікі дзейнічаюць на замову чужых, варожых сіл.

ВОДГУК

# 2017 год – Год памяці ахвяр бальшавізму

Вядомы гісторык Ігар Кузняцоў ў двух нумарах "Народнай Волі" (31 студзеня і 1 лютага 2017 г.) надрукаваў артыкул "Большевистский террор (забвению не подлежит…)". Ён у чарговы раз нагадаў пра масавае знішчэнне "контррэвалюцыйных элементаў", якое прывяло да стварэння расстрэльнай "прамысловасці", калі смяротнае пакаранне стала бытавой з'явай.

Скарочаныя назвы карных органаў – ОГПУ, НКВД, МГБ, КГБ – прыводзілі мільёны людзей у жах, а прозвішчы іх карнікаў (Дзяржынскі, Ягода, Яжоў, Берыя і многія іншыя) выклікалі страх і нянавісць. Кожны савецкі грамадзянін з непакоем чакаў начнога стуку ў дзверы, бо ведаў, што могуць прыйсці "кампетэнтныя" людзі, зрабіць ператрус і забраць у "чорны воран". Мне давялося ў дзіцячыя і школьныя гады быць сведкам такіх начных наведванняў тры разы: калі арыштоўвалі майго бацьку ў Мінску і Мядзведжай Гары (Карэлія), а таксама роднага дзядзьку Сяргея Восіпавіча Парфяновіча ў Запарожжы. Нягледзячы на тое, што я меў зусім мала гадоў, тыя падзеі нанеслі маёй душы моцную рану, якую я адчуваў усё жыццё, і нават цяпер, у свае 88 гадоў, шрам ад яе не дае спакою.

Крывавы тэрор супраць уласнага народа праводзіўся бальшавіцкай зграяй на чале з Леніным і Сталіным, якія, дзякуючы спрытнай дэмагогіі і хлусні, доўгі час умудраліся хаваць праўду ад грамадства. Толькі ў час "хрушчоўскай адлігі" і асабліва ў час "перабудовы" сталі вядомы многія факты бальшавіцкага тэрору, хаця шмат якія застаюцца яшчэ сакрэтнымі.

Ігар Кузняцоў паведамляе, што, паводле афіцыйных дадзеных, у БССР у 1920–1940-я гады было рэпрэсіравана больш за 600 тысяч чалавек (а паводле падлікаў незалежных даследчыкаў – звыш паўтара мільёна). Як цяпер вядома, у тыя гады толькі ў Мінску было больш за дзесяць месцаў масавых расстрэлаў (Курапаты, раён Камароўскага рынку, Лошыца, Дражня, Сляпянка, Масюкоўшчына і іншыя), а па ўсёй рэспубліцы іх налічвалася не менш за сорак.

1937 год – пік бальшавіцкага тэрору. Асабліва трагічны дзень у гісторыі беларускага народа – 29 кастрычніка 1937 года, калі за адну ноч сталінскія каты расстралялі больш за сто выдатных прадстаўнікоў творчай, тэхнічнай і дзяржаўнай інтэлігенцыі. За ўвесь час існавання БССР да 1953 года ў Беларусі было знішчана звыш паловы прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі. А колькі яшчэ раней рэпрэсавана і выслана за межы Беларусі – у тым ліку і мой родны дзядзька, класік беларускай літаратуры Максім Гарэцкі, якога расстралялі 10 лютага 1938 года ў Вязьме. Безумоўна, каб не гэтыя згубы, цяпер мы жылі б у іншай, больш багатай, цывілізаванай, беларускай Беларусі.

З 1937 года прайшло 80 гадоў. Ігар Кузняцоў і яго калегі справядліва прапануюць 2017 год абвясціць Годам памяці ахвяр бальшавіцкага тэрору, а таксама спецыяльна адзначыць памяць ахвяр 29 кастрычніка 1937 года. Я поўнасцю падтрымліваю гэтую вельмі своечасовую ініцыятыву. Патрэбны помнікі ўзгаданым суайчыннікам у месцах іх масавых расстрэлаў, як гэта зроблена ахвярам Другой сусветнай вайны; у імя будучага неабходна асэнсаваць трагічнае мінулае, усім адчуць за гэта адказнасць; на дзяржаўным узроўні асудзіць бальшавіцкі тэрор, правесці грамадзянскае пакаянне і іншыя дзеянні, каб такая з'ява больш ніколі не спасцігла народ. Свой вялікі артыкул Ігар Кузняцоў заканчвае вельмі правільнымі словамі: "…без принятия на себя этого в самом деле тяжелейшего груза ответственности за прошлое у нас не будет никакой национальной консолидации и никакого возрождения".

**Радзім ГАРЭЦКІ, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук.**

SOS!

# Не зачыняйце бібліятэку

Некалі Л.М.Талстой адкрыў бібліятэку ў невялічкай вёсачцы з назвай Ясная Паляна. А вось нашы мясцовыя начальнікі ў Вілейцы хочуць зачыніць чытальню ў мікрараёне завода "Зеніт", дзе пражываюць тысячы людзей. Кажуць, няма грошай на яе ўтрыманне.

Я з такім тлумачэннем не згодна. Вунь колькі чыноўнікаў сядзіць на кожным паверсе ў будынку райвыканкама! Скарачайце штаты – справы не пагоршацца. А вызваленыя сродкі накіруйце на набыццё кніг, часопісаў, газет і на зарплату бібліятэкарам. Не абкрадвайце людзей духоўна!

**Людміла Піліпаўна КАМІНСКАЯ, жыхарка г.Вілейкі.**

Народная Воля
http://www.nv-online.info
28 ЛЮТАГА 2017 г.

ВЕДАЙ НАШЫХ!



# Кацярына Бягун пераскочыла цераз экватар

*Літаральна тыдзень таму беларуска, якая яшчэ ў кастрычніку мінулага года разам з дзвюма дочкамі адправілася ў кругасветнае падарожжа, перасекла экватар.*

Востраў Суматра ў Інданезіі экватар падзяляе на дзве часткі.

*"Адштурхнулася ў Паўночным паўшар'і – прызямлілася ў Паўднёвым!* – каменціруе здымак Кацярына Бягун. – *З зімы ў лета адным махам. Экватар! Так, пераскочыць яго – гэта была мая мара. Эмоцый – фантан! Добра, калі мары здзяйсняюца!"*

А днямі беларускія падарожніцы пабывалі на самабытным востраве людаедаў.

*"Толькі ў XIX стагоддзі тут у дзяржаўным законе прапісалі пункт, які забараняе людаедства,* – распавядае Кацярына. – *Раніцай выходзілі на шпацыр і назвалі гаспадару гатэля вёску, куды мы сабраліся. Ён ухваліў: «Выдатны выбар! І людаедаў сустрэнеце!» Самае смешнае ў гэтым жарце было тое, што ён, улічваючы мясцовую гісторыю, не быў падобны на жарт. «Не хвалюйцеся,* – з усмешкай супакоіў уладальнік гатэля. – *Гэта мая прабабуля людзей ела, а нам уже нельга...»*

*Варта заўважыць, што Паўночная і Заходняя Суматра – месцы зусім не турыстычныя. І турыстаў тут няма, і камфорту асаблівага таксама. Таму адпраўляемся далей!»*

Нагадаем, што кругасветка Кацярыны Бягун і яе дачок будзе доўжыцца яшчэ амаль паўгода.

**Марына КОКТЫШ.**

БЛОКИРОВКА

# Шесть стран временно лишены права голосования

Шесть стран временно лишены права голосования на Генеральной Ассамблее ООН из-за неуплаты членских взносов. Об этом говорится в сообщении ООН.

Главным должником является Венесуэла, которая сможет принимать участие в голосовании лишь после того, как заплатит 24 миллиона долларов. Другие пять стран, которые лишены права голоса до конца работы 71-й сессии Генассамблеи ООН, то есть до осени 2017 года, – это Кабо Верде, Ливия, Папуа-Новая Гвинея, Судан и Вануату.

Странам-должникам вернут право голоса, если они заплатят долги как минимум за два года. Об этом заявил новый Генеральный секретарь ООН Антониу Гутерриш. Суммы ежегодных взносов рассчитываются для каждой страны индивидуально.

ФРАНЦИЯ

# Эммануэль Макрон выходит в лидеры президентской гонки




Во Франции в лидеры президентской гонки выходит независимый кандидат **Эммануэль Макрон.** У него есть все шансы выйти во второй тур и там победить лидера «Национального фронта» Марин ле Пен. Таковы данные последних опросов, опубликованных в воскресенье. Марин ле Пен на встрече с избирателями не преминула обрушиться на соперника:

– Как проевропейский фанатик Эммануэль Макрон может рассчитывать на понимание со стороны Великобритании, где идет «брексит», или Италии, которая недавно на референдуме сказала «нет» Европейскому Союзу, или Нидерландов, которые готовятся к победе националистов во главе с моим другом Гертом Вильдерсом?

По данным опросов, Макрон победит ле Пен во втором туре примерно 60% против 40%.

ПРИМЕР

# Амбициозная цель Берлина

Столица Германии поставила перед собой амбициозную цель: свести к нулю выбросы углекислого газа в городском хозяйстве к 2050 году. Одна из составных частей этого плана – электрификация городского транспорта.

Пока автобусы с электрическими двигателями не готовы к широкому внедрению (одной зарядки аккумулятора хватает лишь на 18 километров пути), в Берлине тестируют экоавтобусы нового поколения на сжатом природном газе – в качестве технологии переходного периода.

НУ И НУ!

# В Крыму судят противников присоединения к России

Почти два года в аннексированном Россией Крыму продолжается громкий судебный процесс. Обвиняемым, участвовавшим в митинге в поддержку территориальной целостности Украины, грозят немалые сроки.

ЭВРИКА!

# Беспилотные автомобили

За последние несколько лет в индустрии беспилотных автомобилей произошел невероятный прогресс. Все указывает на то, что будущее, в котором мы сможем сесть в машину и заниматься своими делами, пока она сама везет нас до места назначения, уже совсем не за горами.

Как сообщает Bloomberg, компания Ford собирается перейти к полной автоматизации беспилотных автомобилей. В статье говорится, что такое решение было принято потому, что инженеры, производящие тестовые поездки на беспилотниках, стали засыпать за рулем от скуки – ведь им практически ничего не надо было делать.

В январе на Международной выставке потребительской электроники (CES) в Лас-Вегасе представитель Ford в конфиденциальном разговоре рассказал, что компания планирует выпустить полностью автоматизированную машину уже в 2021 году.

«Автомобиль, который мы запустим в 2021 году, будет полностью автоматизирован – у него не будет ни руля, ни педали тормоза. Это означает, что водителю не придется в какой-то момент брать управление транспортным средством на себя – оно само будет знать, что делать в любой ситуации», – рассказал представитель компании.

Возможно, по мере того, как технологии будут улучшаться, мы будем чувствовать себя более расслабленно – сможем не тянуться к рулю, а вместо этого перекусить или посмотреть фильм. Но тогда мы не сможем быстро среагировать в случае, если понадобится вмешательство человека.

СЛЫШАЛИ?

# Генсек ООН призывает к реформе этой организации



ООН необходима большая оперативность и прозрачность в принятии решений, действенность в их выполнении, заявил **Антониу Гутерриш.**

Политические кризисы, терроризм и многочисленные войны требуют масштабных реформ Организации Объединенных Наций, считает Генеральный секретарь ООН Антониу Гутерриш. *«Наши структуры недостаточно дееспособны»,* – заявил Гутерриш, выступая на Мюнхенской конференции по безопасности.

ГРОМКОЕ ЗАЯВЛЕНИЕ

# В Киеве заявили о разработке «бескомпромиссного» плана по возвращению Крыма и Донбасса



Глава Министерства внутренних дел Украины **Арсен Аваков** заявил в интервью местному телеканалу, что власти страны в настоящий момент разрабатывают план по возвращению Крыма и Донбасса под контроль Киева. Он подчеркнул, что этот план *«совершенно не связан ни с малейшими уступками»,* сообщает РИА «Новости».

По мнению Авакова, возвращение Крыма и Донбасса возможно только дипломатическим путем, а не военным.

Отметим, что в середине февраля президент США **Дональд Трамп** дал понять Москве, что будет добиваться возвращения Крыма и Севастополя под контроль Украины.

В Кремле на это ответили, что тема возвращения полуострова не обсуждается. В частности, пресс-секретарь президента РФ **Дмитрий Песков** отметил, что Россия не обсуждает вопросы, связанные со своей территорией, с зарубежными партнерами. Официальный представитель МИД РФ **Мария Захарова** на брифинге во внешнеполитическом ведомстве также подчеркнула: *«Мы свои территории не возвращаем. Крым является территорией Российской Федерации».*

УРАЖАННІ

# Гастролі Зміцера Вайцюшкевіча за акіянам

Зміцер Вайцюшкевіч не ў пашане ў беларускіх улад. Але яго, спевака з нацыянальным каларытам, любіць народ, асабліва моладзь.

Нядаўна ён вярнуўся са Злучаных Штатаў Амерыкі і Канады. Гэта было яго самае працяглае падарожжа за акіян. Выступленні Зміцера з поспехам прайшлі ў Нью-Ёрку, Нью-Джэрсі, Вашынгтоне, Таронта, Атаве і Сан-Францыска.

Зусім хутка, 4 сакавіка, у Вільнюсе адбудзецца прэзентацыя новага дыска спевака, які будзе называцца **"У наших снах".** У яго ўвайшлі кампазіцыі з альбомаў "Танга з ружай", лепшыя песні з дыскаў "Тое, што трэба", "Наша песня", новыя песні.


Ля Ніягарскага вадаспада.


З Івонкай Сурвілла.

**– Зміцер, хто з вядомых прадстаўнікоў дыяспары наведаўся на вашы канцэрты?**

– У Нью-Джэрсі прыходзіў Янка Запруднік, у Атаве – Івонка Сурвілла. Шмат было ў залах людзей, якія даўно з'ехалі, але прыходзілі на канцэрты і тыя, хто нарадзіўся ўжо там, за акіянам. Моладзь нясе агеньчык беларускасці, шануе нашы нацыянальныя сімвалы, шчыра жадае, каб нам тут жылося па-людску і Беларусь была беларускай.

Я хачу выказаць асаблівую падзяку прафесару хіміі і вельмі прыгожай жанчыне 80 гадоў Алe Орса Рамана, якая большую частку жыцця пражыла ў Нью-Ёрку. Яна настолькі прыязна да мяне паставілася, што нават запрасіла дахаты. Наогул, мной добра апекаваліся паўсюль. Я прачынаўся – і мяне ўжо чакаў сняданак.

**– Раскажыце, калі ласка, пра вашых сяброў у Амерыцы і Канадзе...**

– Валянціна і Юрась Шаўчэнкі ініцыявалі маю паездку ў Канаду. У Атаве жыве навуковая інтэлігенцыя: хімікі, медыкі, біёлагі. У кожнага з іх свае шляхі эміграцыі, але яны не згубілі сувязі з Радзімай.

Прырода Канады падобна на беларускую. У паўночнаамерыканскіх гарадах цэнтр забудовы складаюць высокія будынкі, гатэлі, дзелавыя офісы і гіпермаркеты. А ў прыватнай забудове менш паверхаў, дамы некрыклівых, спакойных колераў. Нідзе не бачыў, каб людзі палілі цыгарэты. У Варшаве і ў Мінску за адну гадзіну сустрэў больш курыльшчыкаў, чым там за тры тыдні. Амерыканцы і канадцы актыўна займаюцца здароўем, гуляюць у парках, ходзяць у трэнажорныя залы. Там ёсць шмат сучасных цэнтраў культуры і мастацтва, абсталяваных па апошнім слове тэхнікі.

Мы былі ў парламенце ў Атаве. Можна прыйсці на пасяджэнне і паслухаць, пра што там гавораць. Звонку будынак канадскага парламента выглядае, як сапраўдны брытанскі. Унутры – квадратнае памяшканне з ярусамі крэслаў, дзе дэпутаты абмяркоўваюць важныя пытанні.

Вельмі эмацыянальна ў Амерыцы і ў Канадзе ўспрымаюць новага прэзідэнта ЗША. Трамп-Трамп-Трамп – гучыць паўсюль. Ёсць шмат каналаў, на якіх крытыкуюць Трампа, і іх ніхто не збіраецца зачыняць. Амерыканскія зоркі падзяліліся: хто за Трампа, хто катэгарычна супраць, – але свабода слова прысутнічае.

**– Якая музыка зараз папулярна ў Амерыцы?**

– Амерыка дазваляе кожнаму жыхару знайсці нешта сваё. Вельмі папулярна музыка кантры, народная музыка ў сучасных аздабленнях з блюзам.

**– Як уздзейнічаюць на чалавека такія цуды прыроды, як Ніягара, возера Антарыё?**

– Каля самога вадаспада вельмі холадна, вялікія плыні вады і моцны вецер, немагчыма доўга стаяць. Побач з ракой Ніягарай мы спявалі з Валянцінай Шаўчэнка "Цвяток радзімы васілька" Максіма Багдановіча. З аднаго боку – Амерыка, а з другога – Канада. Я выканаў там таксама песню "Шалік" на вершы Някляева. Праз тыдзень песня будзе ўжо ў інтэрнэце, а дыск я назваў "У нашых снах". Туды ўвайшлі лепшыя песні, напісаныя ў супрацоўніцтве з Уладзімірам Някляевым і WZ-Orkiestra за 10 гадоў, і пяць новых песень. Альбом будзе прэзентаваны ў Вільнюсе 4 сакавіка.

**– Ці праехаліся вы па Залатым мосце ў Сан-Францыска?**

– Амерыканцы называюць яго "голдэн гэйт" – "залатая брама". І я ўвесь час будую культурныя масты паміж Захадам і Усходам. У маёй душы нарадзілася аналогія: у гэтым годзе спаўняецца 80 гадоў песні "Бывайце здаровы, жывіце багата" Адама Русака і таксама 80 гадоў, як пабудавалі мост, які злучае Сан-Францыска з прыгарадам Саўсаліта.

Сан-Францыска – гэта горад кантрастаў, радзіма хіпі, горад вольнасці і дэмакратыі, цёплы і сонечны. У Сан-Францыска я сустрэўся з Алесем Пузынем, з якім мы разам ігралі ў "Палацы" і ў "Крыві" і які 15 гадоў таму з'ехаў у Амерыку.

**– Што вы прывезлі дзецям Язэпу і Стэфе па іх просьбе?**

– Стэфе – сукенку з Сан-Францыска, Язэпу – цёплую шапку з надпісам "Канада". Яны зараз у Варшаве з мамай, якая знаходзіцца на стажыроўцы. Я заехаў да іх у Варшаву і спяшаўся ў Мінск на канцэрт "Народнага альбома" ў "Прайм Холе".

**– Кажуць, што Амерыка прасякнута ідэяй рэалізацыі мроі, а якая ваша беларуская мара?**

– Мая беларуская мара – каб наша песня была пазнавальная ва ўсім свеце. І не важна праз каго. Што тычыцца настрою – мару пра агульначалавечыя радасці. Мне здаецца, што беларус павінен быць больш амбітным і актыўней адстойваць сваё месца пад сонцам.

**– Калі Генадзь Мікалаевіч Бураўкін вярнуўся з паездкі ў ЗША, ён напісаў верш:**

*Я прыду сівелым і стамлёным*
*Да маёй любімай Беларусі,*
*Паздароўкаюся з кожным клёнам,*
*З кожнаю бярозкай абдымуся.*

**А што ў вас нарадзілася ў душы, калі прыехалі дадому?**

– Мне ўвесь час хацелася паехаць на хутар у Вайцюшкі, на Нёман. Я вярнуўся, каб адчуць вясну і абуджэнне прыроды. Але і Нью-Ёрк, і Атава, і Нью-Джэрсі, і Філадэльфія, людзі, якія там жывуць, усе разам спявалі бураўкінскую калыханку. Для іх гэта важная песня.

**Гутарыла Эла ДЗВІНСКАЯ.**

ТРАГЕДИЯ

# Убийство на охоте

*В сентябре 2015 года Иван БОГДАНОВ и Дмитрий СОСНОВ отправились на ночную охоту за город. Мужчины дружили давно и часто охотились или рыбачили вместе. Так было и в этот раз. Только домой Иван вернулся уже один: пуля из его карабина, предназначенная для лося, попала в сердце друга. О том, что произошло той осенней ночью и как изменилась жизнь после случившегося, Иван Богданов искренне рассказал «Народной Воле».*

## На охоту только с другом

Иван Богданов и Дмитрий Соснов познакомились в 1999 году. Оба опытные и заядлые охотники. Иван занимался бизнесом, а Дмитрий работал в госсекторе. Позже он пошел на повышение, переехал в областной центр.

– *Это был мой близкий друг,* – говорит Иван Сергеевич. – *Мы не только вместе охотились, рыбачили, но и дружили семьями.*

В доме у Богданова есть небольшая комната охотника. На стенах трофеи, бинокль, календари, на которых хозяин отмечал количество поездок в лес в течение года. Показал хозяин и свои записные книжки, где он после каждой охоты фиксировал важные и интересные детали. С 1998 года Иван исписал три толстых ежедневника.

– *Это не личный дневник, куда вносят впечатления о прожитом дне,* – объясняет мой собеседник. – *Я записывал основные вехи поездок на охоту.*

Иван листает страницы, большинство записей с 2005 года начинаются словами: «*Заехал за Сосновым*». Последние строки были написаны летом 2015 года.

О том, что случилось в лесу, Иван Богданов написать не смог.

## Роковой выстрел

Запланированная охота на лося ничем не отличалась от многочисленных предыдущих. Из областного центра друзья выехали в лесничество недалеко от города. Там их уже ждал местный лесничий, который на месте подготовил все необходимое.

– *Втроем мы поехали в лес,* – вспоминает тот вечер Богданов. – *Договорились, что Дима будет подманивать зверя. Заняли заранее обговоренные позиции. Мы находились на расстоянии 40 метров друг от друга. И пока было светло, я его видел, так же как и он меня. Соснов вабил зверя: сначала голосом, потом шевелил куст. Скоро лось отозвался.*

По словам Ивана Сергеевича, он увидел идущего навстречу зверя на расстоянии 80–90 метров. Несколько секунд охотник наблюдал за добычей через прицел ночного видения, а потом выстрелил из карабина. Сомнений, что на него шел лось, у мужчины не было тогда, нет и сейчас.

– *После выстрела я немного подождал,* – восстанавливает произошедшие события Богданов. – *Пошел смотреть и наткнулся на Соснова. От моей позиции до места его гибели было 18 метров. Сначала подумал, что он шутит: забежал вперед и лег. Но оказалось, что нет. Пуля попала в сердце.*

Первые минуты после случившегося Иван Богданов находился в состоянии шока. Пока лесничий вызывал и встречал соответствующие службы, он сидел рядом с телом погибшего друга.

– *Самый страшный момент был, когда наш спутник ушел,* – рассказывает Иван Сергеевич. – *На самом деле прошло около часа, но мне казалось, что гораздо больше.*

После проведения экспертами технических мероприятий поехали в районный отдел милиции для дачи показаний. По завершении необходимых объяснений и процедур около 8 утра мужчина вернулся в город. Заехал домой за супругой, и они сразу же отправились к вдове погибшего.

О том, что произошло в лесу, Ирина Соснова еще не знала.

– *Она сначала не поверила, подумала, что шутка,* – вспоминает участник охоты. – *Потом крик, истерика… Прибежали соседи, потом приехали коллеги с работы. У Димы двое детей остались.*

Похоронили Соснова на его малой родине под Минском.

## Должник до конца дней

Через 10 дней после трагедии Ивана вызвали в Следственный комитет. Там он узнал, что по факту произошедшего открыто уголовное дело.

Мужчине инкриминировали часть 1 статьи 144 Уголовного кодекса: причинение смерти по неосторожности. Следствие по делу завершилось в январе 2016 года. Все это время Иван Богданов находился на свободе, никакого давления на него не оказывалось.

– *Есть несчастный случай, а есть преступление,* – рассуждает он о вменяемой ему статье. – *Что такое причинение смерти по неосторожности? Это либо легкомыслие, либо небрежность. В первом случае человек предполагал возможный исход, но, как говорится, махнул рукой. А когда он не предвидел наступления опасности для окружающих, но при должной внимательности мог это сделать, это считается небрежностью.*

*В моей ситуации получается, что при нужной осмотрительности я должен был предвидеть, что товарищ встанет под ствол. Как это сделать, учитывая, что Соснов являлся участником охоты, занимал свою позицию и имел немалый опыт?*

Весной прошлого года по приговору суда Ивана Богданова признали виновным и осудили по ч.1. ст.144 УК РБ на 3 года ограничения свободы без направления в исправительное учреждение открытого типа. Кроме этого его лишили права заниматься охотничьей деятельностью на 5 лет. Также он обязан выплатить родственникам погибшего денежную компенсацию в размере около 60 тысяч белорусских рублей (деноминированных).

Сегодня Иван Богданов уже не директор фирмы, а работает по найму, заработок – 400–500 рублей, 70 процентов которых каждый месяц идут на погашение долга. Его банковский счет арестован, а имущество (оружие, автомобили, бытовая техника) выставлено на продажу.

– *Проблемы фирмы не связаны с произошедшей трагедией,* – рассказывает Богданов. – *В коммерческой сфере кризис. Заказов не было, да и сейчас нет. На сегодняшний день выплачено около 10 тысяч рублей. Также от общей суммы 10 процентов пойдут в счет государства. Сейчас долг составляет приблизительно 50 тысяч рублей. Подсчитал, что выплачивать буду где-то до 87 лет, то есть пожизненно.*

## Вопросы без ответов

Как опытный охотник оказался под стволом товарища? Почему, не предупредив, он покинул заранее выбранную позицию? На эти вопросы уже никто не ответит, остается лишь строить предположения.

– *Скорее всего, Дмитрий подошел, чтобы пошевелить ветку дерева, а она не поддавалась,* – говорит Иван Богданов. – *Он зашел с другой стороны. И не заметил, как переместился. Не придал этому значения и потерялся в пространстве. Думая, что идет в одном направлении, пошел в другом. То есть произошла дезориентация в лесном массиве, когда стемнело. Хотя прокурор сказал, что этого быть не могло, а я пытаюсь себя выгородить.*

*Я не отрицаю, что Соснов погиб от пули из моего карабина. Он мог перемещаться по лесу как угодно, но я-то должен был об этом знать! Можно было посветить или подать другой знак, но обозначить себя. Учитывая, что я не покидал свою позицию, о которой он знал.*

Из приговора суда следует, что Иван Богданов произвел выстрел по неотчетливому силуэту в условиях плохой видимости. Тем самым нарушил «Правила ведения охотничьего хозяйства и охоты». В процессе разбирательства было проведено два следственных эксперимента с целью проверки показаний Богданова и лесничего, который сопровождал друзей на охоте.

Как объясняет наш собеседник, результаты экспериментов отличались друг от друга.

– *На первый эксперимент мы поехали в конце сентября,* – вспоминает Богданов. – *Следователь пригласил понятыми двух солдат-срочников. Замеры производились лазерной рулеткой, и при направлении ее луча на камуфляж солдата фиксации не происходило. Тогда следователь передал солдату папку, навел на нее луч и сделал замер. Через прицел ночного видения силуэт статиста был виден очень плохо. Следствие посчитало, что я стрелял по человеку, приняв его за лося. Но силуэт человека и лося – это, как говорится, две большие разницы.*

*Также во время эксперимента в тот день лесничий дважды криком гонял идущих на нас лосей.*

Позднее на допросе Иван Сергеевич объяснял, что солдат в военной форме в прицел ночного видения заметен намного хуже, чем человек в гражданской одежде.

Повторный следственный эксперимент провели в начале ноября.

– *Мы опять поехали на место,* – продолжает Богданов – *Там нас уже ждал лесничий и двое понятых-охотников. На одном из них была такая же куртка, как на Соснове в ту ночь. Подождали, пока стемнеет, заняли позиции, как в день трагедии. Через прибор ночного видения четко был виден человек. Следователи считали, что в прицеле человек будет виден плохо, а оказалось наоборот. И перепутать лося с Сосновым я никак не мог.*

Разница между двумя экспериментами в следующем: солдат-срочник был одет в камуфляжную форму из ткани «Альфа», в которую в 2010 году переодели белорусскую армию. Преимущество ее в том, что военнослужащий делается практически незаметным для инфракрасного излучения. Проще говоря, через оптический прицел будет виден неотчетливый силуэт, в который трудно прицелиться.

А статист на втором эксперименте был в обычной гражданской (охотничьей) куртке.

– *На эксперименте в ноябре статисту было предложено даже изменить местоположение и укрыться среди кустов,* – рассказывает Иван Сергеевич. – *Но все равно был виден четкий силуэт человека. Это отметили все участники эксперимента. Внесли в протокол. Но суд результаты второго следственного эксперимента во внимание не принял, сославшись на метеорологические изменения в сентябре и ноябре.*

На суде охотник просил исследовать вопрос, был ли лось в тот вечер на участке. Оспаривать утверждение Богданова, что зверь был, никто не стал.

– *Но если зверь был, тогда почему считают, что я стрелял не по нему, а по Соснову?* – делится своими доводами Иван. – *Во-первых, он находился от меня на расстоянии 18 метров. Подпускать лося так близко к себе опасно и безрассудно. Во-вторых, если бы даже я стрелял в него на таком расстоянии, то сделал бы не один выстрел.*

*Если лося не было, тогда, да, я перепутал и выстрелил в человека. Но если зверь появился, то почему суд не допускает, что я стрелял в лося, а между нами в этот момент встал человек? В прицел я видел голову и рога лося, соответственно, стрелял в него.*

**– Свою вину вы не признали?**

– *Прежде чем выстрелить, я полчаса слушал, смотрел. Решение суда основано только на предположении. Если лось мне померещился, то вопросов нет, но этого никто не подтвердил. Произошел несчастный случай, в который может попасть любой.*

*Даже если предположить, что я перепутал человека с лосем, то пуля попала бы в левый бок или грудь, но под большим углом. А ранение в спину, значит, Соснов или стоял, или шел в направлении от меня. Получается, что моя преступная небрежность заключается в том, что я не заметил ничем не обозначившего себя человека, который покинул свою позицию (не предупредив) и оказался в моем секторе стрельбы.*

**– Вы допускаете фальсификацию дела?**

– *Нет. В деле нет ни одного слова неправды. Но задача, видимо, была следующая: не разобраться, а назначить виновного, который за все ответит. Из показаний лесничего следует, что он слышал зверя. Значит, лось был. Судом доказано, что Соснов нарушил правила охоты, сошел с места, но это не явилось причиной его гибели. Всему виной моя преступная небрежность?*

*Я понимаю родственников погибшего. Им очень тяжело. Приговор суда основан на предположении, что я стрелял по неясно видимой цели, то есть по Соснову. Но это не так. Суд не захотел разобраться в вопросе, что такое цифровой пиксельный камуфляж. Между военной формой и курткой Соснова разницы не нашли. Тогда зачем нужно было переодевать в этот камуфляж армию?*

*На апелляционном суде прокурор сказал, что Соснов пошевелил куст, и я выстрелил. Но между мной и местом гибели не было кустов – это просто выдумка. Также было заявлено, что если Соснов вабил зверя, значит, он и руководил охотой: мог ходить, где хотел. И раз он туда вышел, значит, лось уже ушел. На чем основано это предположение – не понятно.*

## Жизнь после трагедии

В прошлом году Иван Богданов подал апелляционную жалобу. Решение суда оставили без изменения.

Сейчас Иван Сергеевич живет под надзором. Два раза в месяц он обязан отмечаться в милиции. На дорогу до работы (туда и обратно) дается по одному часу. Домой поднадзорный должен вернуться не позднее 21.00.

Проверить его нахождение на домашней территории сотрудники могут в любой момент.

– *О том, что произошло, вспоминать трудно,* – говорит бывший предприниматель. – *Еще в лесу, сидя над телом друга, говорил: «Как мне с этим теперь жить?!» После суда ездил к Дмитрию на могилу. Приснился он мне только один раз: мы с ним разговаривали легко, спокойно.*

Больше о своих переживаниях мужчина говорить не стал.

На вопрос, возьмет ли в руки оружие после окончания срока запрета, также не ответил.

– *У Вани была ужасная депрессия,* – сказала мне супруга Богданова. – *Он все время молчал. Мы с Сосновыми дружили семьями, но меня также вычеркнули из круга общения. Конечно, им очень тяжело. Сегодня, если бы понадобилась помощь, то мы сразу откликнулись бы.*

## «Произошел несчастный случай»

«Народная Воля» связалась с лесничим, который сопровождал друзей на охоте, и попросила рассказать о том, что, на его взгляд, случилось в тот роковой вечер.

– *Я ничего не хочу вспоминать,* – после долгой паузы ответил он. – *Произошел несчастный случай. Лось отзывался вдалеке. Было слышно. Но я ведь не рядом с охотником находился. Сейчас работаю в этом же лесничестве. Но ворошить прошлое не хочу.*

## «Ничего не хочу говорить»

С целью избежать обвинений в необъективности мы связались с сестрами Дмитрия Соснова. К сожалению, они отказались комментировать произошедшее, а также запретили использовать имена и фамилии в публикации. По мнению родственников, в трагедии виноват исключительно Иван Богданов.

Вдова погибшего охотника разговаривать о трагедии отказалась.

– *Говорить и вспоминать ничего не хочу,* – ответила она. – *Ничего. Извините.*

**Роман ВАСЮКОВИЧ.**

**P.S.** *В силу ряда причин имена и фамилии в статье изменены.*

ГУЧНАЯ СПРАВА

# Па максімуме…

*Учора пракурор запатрабаваў для Уладзіслава Казакевіча, які напаў на людзей з бензапілой у гандлёвым цэнтры, 15 год турмы.*

У Мінскім гарадскім судзе працягваецца разгляд справы **Уладзіслава Казакевіча**, які 8 кастрычніка 2016 года напаў з бензапілой на людзей у сталічным гандлёвым цэнтры «Новая Еўропа», забіў аднаго чалавека і параніў некалькі. Акрамя таго, стала вядома, што хлопец рыхтаваў і іншыя забойствы, што і не ўтойваў падчас судовага працэсу. Казакевіч сваю віну прызнаў.

Маці, сястра і дачка загінуўшай **Алены Александронец** папрасілі для яго самага суровага пакарання, якое дазваляе закон. Паколькі Уладзіслаў Казакевіч на момант нападзення быў непаўнагадовым, паводле беларускага заканадаўства, яго немагчыма пакараць больш як на 15 гадоў зняволення.

Агульная сума ўсіх іскаў пацярпелых да Казакевіча склала 266 тысяч рублёў.

ФОТАФАКТ

# У Дзяржынску «вырасцілі» паўтараметровы лядзяш

*Пры гэтым “сталагміт” з’явіўся на зямлі.*



У рэдакцыю звярнуўся наш чытач і аўтар **Лявон Целеш** з Дзяржынска і распавёў пра цікавы факт: *“Звычайна бліжэй да вясны з карнізаў будынкаў звісаюць ледзяшы, якія ўяўляюць пагрозу для пешаходаў. А ля нашай хаты ў Дзяржынску за зіму вырас ад зямлі сапраўдны сталагміт. На здымку – мая жонка Людміла побач з гэтым ледзяным цудам”.*

Паводле слоў Лявона Целеша, яшчэ месяц таму вышыня ледзяша была адзін метр, а зараз – паўтара.

**Алесь СВЯТЛАНІЧ.**

ГЛЯДЗІЦЕ, ХТО ПРЫЕХАЎ...

# 99 рарытэтаў і князь Радзівіл уласнай персонай

Чулі? З Варшавы ў Мінск прыбыў князь **Мацей Мікалай Радзівіл** уласнай персонай. Выстава твораў з яго родавай калекцыі ў Нацыянальным мастацкім музеі ўчора адкрылася афіцыйна – у прысутнасці міністра культуры **Барыса Святлова,** замежных паслоў, дыпламатаў, беларускіх гісторыкаў і мастакоў.



Але ў Мінску князь са сваім стрыечным братам Міхалам з’явіўся на дзень раней. І перш чым сустрэцца з беларускім істэблішментам, ён правёў сустрэчу з публікай. У нядзелю ўвечары ў музей прыйшло чалавек сто. Мы зручна расселіся на загадзя падрыхтаваныя крэслы, і князь даволі падрабязна распавёў пра шматлікія экспанаты сваёй калекцыі: кім былі створаны карціны, дзе захоўваліся, як трапілі да яго ў рукі.

Пан Мацей першы раз пабываў у Беларусі 30 гадоў таму. Ён прызнаўся, што і ўявіць сабе тады не мог, што галоўны мастацкі музей краіны адчыніць для яго свае дзверы. Але праўды дзеля трэба заўважыць, што 30 гадоў таму ў яго яшчэ і сапраўднай калекцыі не было – толькі некалькі карцін, якія віселі ў доме на сценах. Багацці Радзівілаў пасля Другой сусветнай вайны былі раскіданы ледзь не па ўсёй Еўропе – у прыватных калекцыянераў, далёкіх сваякоў, а таксама ў дзяржаўных музеях. Мацей Радзівіл змог сабраць родавыя рарытэты толькі пасля падзення камуністычнага ладу ў Польшчы, калі заняўся бізнесам і назапасіў сродкі для куплі карцін.

– Мая сем разоў прапрабабуля па матчынай лініі – Ізабэла Чартарыйская – першая мэтанакіравана занялася стварэннем калекцыі выяўленчага мастацтва. Але ў эпоху камунізму – не самы прыемны час для нашай сям’і – мы многае страцілі. І не толькі творы мастацтва ... – заўважыў са значэннем пан Мацей. – Асноўныя скарбы калекцыі Ізабэлы Чартарыйскай зараз знаходзяцца ў Кракаве, у тым ліку «Дама з гарнастаем» Леанарда да Вінчы.

У Мінск нашчадак Радзівілаў прывёз 99 прадметаў мастацтва: партрэты сваіх продкаў – вядомых дзеячаў нашай агульнай гісторыі Барбары Радзівіл, каралевы Польшчы, яе бацькі Юрыя Радзівіла, які меў ганаровую мянушку Геркулес Літоўскі, Мікалая Крыштофа Радзівіла Сіроткі – заснавальніка Нясвіжскай рэзідэнцыі, Міхала Казіміра Радзівіла Рыбанькі – заснавальніка мануфактуры слуцкіх паясоў, Караля Станіслава Радзівіла па мянушцы Пане Каханку і іншых.

– Нешта я купляў на аўкцыёнах, іншыя палотны – у вядомых калекцыянераў, якім цалкам давяраю. Штосьці прыйшло з замка Вавеля, з замкаў Сапегаў. Але некалькі прадметаў я атрымаў у спадчыну ад бацькоў і ад траюраднага брата. Гэта сапраўдныя сямейныя рэліквіі, пад якімі я, можна сказаць, вырас. Напрыклад, акварэль Юльяна Фалата «Паляванне ў Нясвіжы з удзелам кронпрынца Вільгельма». Пасля вайны мая бабуля жыла ў маленькай кватэрцы, у яе не было магчымасці захоўваць карціны дома, і яна аддала 29 партрэтаў у музей. А гэтую акварэль захавала. На ёй намаляваны мой прапрапрадзед са сваім сваяком крон-прынцам Вільгельмам, які ў будучыні стаў апошнім імператарам Германіі Вільгельмам II. У 1886 годзе ён прыехаў да Радзівілаў на паляванне. І яны завалілі мядзведзя, нягледзячы на тое, што стаяла зіма і мядзведзі былі ў спячцы. Але, паколькі маёнтак наведаў сам кронпрынц, мядзведзям прыйшлося прачнуцца, – пажартаваў пан Мацей.

Беларуская публіка была вельмі ўважлівая і прыязная да нашчадка слыннага магнацкага роду. Пану Мацею прыйшлося надоўга затрымацца ў музеі – людзі ішлі і ішлі за аўтографамі. А некаторыя так і з падарункамі – кнігамі і альбомамі пра Радзівілаў, якія выйшлі ў Беларусі.

Выстава «Радзівілы: лёс краіны і роду» будзе працаваць да 16 красавіка. Наведайце, не пашкадуеце.

**Алена МАЛОЧКА.**
**Фота Антона КІРЭЕВА.**

ИЗ СЕМЕЙНОГО АРХИВА

# Витольд и женщины



Недавно в Национальный художественный музей из семейного архива известного белорусского кинорежиссера и оператора Дмитрия Зайцева поступило редкое фото послевоенного времени. На нем шесть скромно одетых женщин (усталых, недавно переживших страшную войну) расположились рядом с народным художником БССР и РСФСР Витольдом Бялыницким-Бирулей на фоне его триптиха.

Наш музей очень заинтересовался этим фотодокументом.

Все, что связано с именем живописца Витольда Бялыницкого-Бирули, скрупулезно собирается белорусскими искусствоведами. Он знаковая персона для Беларуси. Передвижник, академик императорской Академии художеств в Санкт-Петербурге, человек эпохи Третьякова и Левитана. Первый – Третьяков – купил у него несколько картин, со вторым – Левитаном – Витольд Каэтанович нежно дружил, даже построил себе дачу «Чайка» в Тверской губернии, чтобы вдохновляться местами, связанными с великим русским пейзажистом. Но, осев на жительство в России, Бялыницкий-Бируля тем не менее безоговорочно признавал своей родиной Беларусь, считал себя белорусским художником.

Чем еще интересно это старое фото?

Рассказывает Надежда Усова, заведующая отделом научно-просветительской работы Национального художественного музея:

– Прежде всего фото интересно датой – по моему мнению, это 1948 год. Витольд Каэтанович жил в России, но уже в звании народного художника БССР приехал в Минск на съезд Союза художников. Первый секретарь ЦК КПБ Пантелеймон Пономаренко прекрасно понимал ценность его творчества для республики и всячески способствовал тому, чтобы Бялыницкий-Бируля появлялся у нас как можно чаще. Тем более именно в тот год на съезде был организован важный диспут о национальных белорусских художниках. И впервые заявлено, что и Зарянко, и Горавский, и Хрущкий – это белорусские художники. Так сказать, состоялась первая публичная констатация того, что история искусств Беларуси начинается с Пэна, Кугеля и Альперовича, а гораздо раньше, с известных художников XIX века, которые родились на территории Беларуси. Хотя потом им выпало жить в другом месте. И именно тогда на съезде Бялыницкий-Бируля еще раз подтвердил, что он белорусский художник.

– Принимали Бялыницкого-Бирулю очень хорошо: он был уважаем коллегами, сфотографироваться с ним хотели многие, – рассказывает Дмитрий Евгеньевич Зайцев. – На этом фото рядом с Витольдом Каэтановичем и его супругой *(на фото – справа)* стоят белорусские художницы 1940–1950-х годов: Софья Ли, моя мама Галина Изергина, жена председателя Союза художников БССР Евгения Зайцева, художница Гавриленко (имени ее, к сожалению, не помню), Малка Беркович… Собственно, все эти фамилии известны немногим, эти художницы, так сказать, удобрили культурный слой Отечества без надежды на посмертную память и награды. Но важно другое: они в тесном кругу рядом с мэтром, рядом с Бялыницким.

Первый послевоенный директор музея Елена Васильевна Аладова вообще вынашивала наполеоновские планы – перевезти Бялыницкого-Бирулю в Беларусь из России навсегда. Она убедила правительство в важности этого имени для истории изобразительного искусства Беларуси, и Витольду Каэтановичу была выделена для временного пребывания в Минске Белая дача, после войны недолго бывшая ближней правительственной резиденцией, а также автомобиль от Пономаренко. Дом был комфортабельным, стоял в старинном парке, и Бялыницкий-Бируля в 1947 году провел там май и июнь, написал 22 этюда, а также ставшую классической картину «Вновь зацвела весна».

Хотя переехать навсегда в Беларусь старика убедить не удалось, он не захотел менять место жительства на склоне лет, покидать могилу дочери, которая именно в это время покончила с собой в результате тяжкой душевной болезни. Но свои картины мэтр продавал главным образом Беларуси. А после его смерти в 1957 году вся коллекция из его поместья «Чайка» в Тверской области – уникальная мебель и более 460 работ – была продана его вдовой Еленой Алексеевной Бялыницкой-Бируля не московским музеям и коллекционерам, а Беларуси, Художественному музею в Минске. За это Аладова выхлопотала вдове квартиру. Представьте, что такое было получить жилплощадь в послевоенной разрушенной столице!

Чего не удалось сделать могущественной Елене Васильевне Аладовой, так это открыть музей Бялыницкого-Бирули в Минске. Она планировала забрать для музея старинный дом рядом с особняком Ваньковича. Так говорила: «Как место Матейко в Кракове, так и Бялыницкому-Бируле место должно быть только в Минске». Но дом все-таки был маловат… А потом власти республики и вовсе переиграли этот план. Так как Бялыницкий-Бируля родился под Белыничами в Могилевской губернии, то под музей художника отдали роскошный особняк XVII века в Могилеве. Теперь там филиал НХМ.

А вчера в Национальном художественном музее к 145-летию со дня рождения выдающегося живописца открылись два зала постоянной экспозиции мемориальных пейзажей Витольда Бялыницкого-Бирули, а также работ, написанных на его даче «Чайка».

Елена МОЛОЧКО.

ДЛЯ ВЯСЁЛАЙ КАМПАНІІ



## Гуляць дык гуляць

Словы Ул.Някляева
Музыка В.Іванова

Сёння ў нашай хаце свята,
Калі ласка, ў нашу хату!
Гэй, рады прыняць –
Гуляць дык гуляць!

**Прыпеў:**
Сёння гудзе ад ранку
Ў нас гулянка,
А ўчора з вячора,
З намі гуляй, хто хоча, хоць да ночы,
Хто адгуляў – спачывай! } *2 разы*

Ліха з горам ды бядою
Скосім разам з лебядою.
Гэй, кінь гараваць –
Гуляць дык гуляць!

**Прыпеў.**


Покуль жывы ў свеце людзі,
Так ці гэтак – неяк будзе.
Гэй, жыць – не ўміраць,
Гуляць дык гуляць!

**Прыпеў.**

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Марыя МАМАШУК:

# «У Індыі мяне ацанілі ў 42 тысячы долараў»



Не так даўно Маша вярнулася з Індыі, дзе правяла амаль месяц. Справа ў тым, што дзвюх беларускіх спартсменак – **Марыю Мамашук** і **Васілісу Марзалюк** – купілі на аўкцыёне ў Індыйскую лігу. А нашы і не былі супраць таго, каб іх купілі…

– У лізе шэсць каманд, і кожная з іх можа купіць чатырох замежных спартсменаў, – кажа Маша. – За месяц да пачатку лігі праходзіць аўкцыён, на якім спонсары гандлююць, выбіраючы з тых спартсменаў, хто падаў заяўку. Глядзяць на спіс тваіх дасягненняў, нават фотаздымак неабходны. У выніку ў камандзе акрамя мяне аказаліся дзве спартсменкі з Індыі, барцы з Украіны і Грузіі і балгарка.

**– Калі не сакрэт, за колькі вас купіў спонсар?**

– За 42 тысячы долараў. Гэтыя грошы аддаюць спартсмену, але з улікам таго, што вылічылі падаткі, на рукі атрымала каля 30 тысяч.

**– Няўжо ў Індыі вольная барацьба карыстаецца такой папулярнасцю, што нават ладзяць аўкцыёны і знаходзяцца багатыя спонсары?**

– Гэта не проста спартыўнае мерапрыемства, а яшчэ і вельмі прыгожае шоу. Індыйцы спрабуюць такім чынам папулярызаваць вольную барацьбу, да камерцыйных стартаў далучаецца тэлебачанне, на спаборніцтвы прыходзіць шмат гледачоў. Адным словам, тут сумяшчаюцца спорт і бізнес. Індыйская ліга, безумоўна, камерцыйны праект. Але выйграюць усе – і спартсмены, якім даюць магчымасць добра зарабіць, і спонсары, якія з гэтага маюць сваю выгаду, і балельшчыкі, якім вельмі падабаецца такія шоу.

**– Спаборніцтвы былі не тэатральнымі пастаноўкамі?**

– Натуральна, не тэатральнымі, усе змагаліся, як на звычайных спаборніцтвах. Хіба што правілы ў Індыйскай лізе для нас некалькі незвычайныя. Напрыклад, я адзін раз перамагла, два паядынкі прайграла і два разы мяне "заблакіравалі". Згодна з іх правіламі, па выніках лёсавання, у якім бяруць удзел капітаны каманд, пераможца можа забараніць двум самым моцным спартсменам з каманды саперніка ўдзельнічаць у паядынку. Вось мяне і "заблакіравалі".

**– Як наогул выступіла ваша каманда?**

– Шостае месца занялі, але з гэтай нагоды пераживанняў ні ў кога не было. Тым больш што замест вопытных індыйскіх спартсменак у каманду ўзялі дзвюх маладых. Але вынік на такіх спаборніцтвах – не галоўнае. Хаця камандзе, якая заняла першае месца, спонсар, здаецца, дадаў яшчэ 3 тысячы долараў.

**– У Індыі вам спадабалася?**

– Супярэчлівыя пачуцці. З аднаго боку, сам турнір – проста супер! З другога – не было нармальнай залы для трэніровак, хаця жылі мы ў сталіцы Індыі. Не хапала апаратаў і пунктуальнасці. Скажучь, напрыклад, што едзем у такі час, а прыязджаюць на паўгадзіны пазней. Уразіла таксама, наколькі Дэлі брудны горад. На вуліцах шмат жабракоў, вечарам у паветры смог, нейкі туман… Адным словам, лепш туды прыехаць, зрабіць сваю справу і з'ехаць дадому.

Алесь СІВЫ.

ВІНШУЕМ!

## Ён з коласаўскіх мясцін



Алесь Камароўскі нарадзіўся 1 сакавіка 1947 года ў вёсцы Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага раёна, У тых мясцінах, дзе ў 1882 годзе з'явіўся на свет Якуб Колас.

А.Камароўскі закончыў філалагічны факультэт БДУ. Працаваў у Мінскай абласной бібліятэцы імя А.С.Пушкіна, у Літаратурным музеі Я.Коласа, на Беларускім тэлебачанні, у часопісах "Маладосць" і "Вясёлка", у выдавецтве "Юнацтва".

З дзяцінства захапляўся футболам, пазней гуляў у розных камандах на першынство рэспублікі. Першы са спартыўных каментатараў стаў весці рэпартажы па тэлебачанні і радыё на беларускай мове, калі ў 1982 годзе "Дынама" (Мінск) стала чэмпіёнам СССР па футболе. Аўтар чатырох зборнікаў паэзіі, аповесцяў "Адкрытая тайна", "Смаката", "Радаслоўны лісток", а таксама аповесцяў на спартыўную тэматыку – "Заваражаны мяч", "Пенальці", "Ахілесава пята".

*Алесь КАМАРОЎСКІ*

* * *

Губляюцца фарбы, адценні
У словах, у звычаях, людзях…
Шкада, што яны – у адзенні…
А можа, не мы гэта – цені,
Якія сябе і не будзяць?
Сціраюцца тонкія грані –
Няўжо мы не бачым, не чуем? –
У дружбе, сяброўстве, каханні…
Пакрыўдзіў, абразіў, параніў…
Ці толькі ў нас чэрствасць начуе?
І рыцарства збегла ў паданні,
Прапалі героях манеры…
Ці проста, як здані, памерлі…
Якое ж у нас апраўданне? –
Характар, натруджанасць, нервы…
Халодных к нечаму болю,
Даём не руку, а параду…
А мы ці гатовы з табою
Да смелага, жорсткага бою
За сябра, за слова, за праўду?
Нам потым лічыць недароды,
Бо сеялі часта на вецер…
Ідзе размыванне пароды…
Вось так уміраюць народы:
У нас, а пасля – і ў дзецях.
Губляем, сціраем і рушым,
Хоць моцна крычым: "Не сказіце!"
Народам народжана – тушым…
Губляем сябе мы і душы,
А ў што пераходзім?
Скажыце!


### Футбол

Спрэс
Людзей калоціць стрэс…
Ад якіх жа стадый ён
Цiск узносіць, быццам прэс?
Ці ратунак даў прагрэс?
Ёсць збавенне –
Стадыён!
Другарадны, можа, матч,
І не з сонечнай пары,
Ды маленькі, жвавы мяч
Нараджае ў нас парыў.
Там, на полі, –
Нашы душы…
Стадыён – дзявяты вал…
І душа ужо не тужыць,
І хвароба нас не душыць,
Не збівае напавал.
Мы – ў імгненні,
Мы – ў імкненні,
Мы – ў адчаянным рыўку…
Мы – працяу паклененні,
Перабродзім па калені
Смерці страшную раку…
А яе цячэнне грозна
Перахоплівае дых
І вяртае тут жа розум
Ад забаў, ад гульняў розных
Да трывожных думак тых…
Думак тых,
Што свет калоціць,
За якія горка плоцяць,
Калі гром саб'е з арбіт…
Ад якіх
Вякоў калодзеж
Сніцца ў цяжкім,
Мёртвым лёдзе,
Дзе на дне –
Сляпы нябыт.
– Гол забілі!..
– Гол забілі!..
Мы – за казкі,
Мы – за былі,
У якіх – вякоў працяг!
Толькі б часам не забылі,
Каб зямлю ў нейтронным пыле
Нехта ўдарам не працяў.
На футболе
Многа болю,
Нават болей
Чым за блізкіх нам людзей…
На футболе
Час няўдач
Трыбуны поле…
На футболе –
Страсці поле,
Паражэнняў і надзей.
Не адна "футбол" праблема…
Нам крычаць бы
Горка, нема,
У званы адчаю біць,
Бо над светам
Вее тленам,
Бо над светам –
Як дылема:
Заўтра быць
Або не быць?!

НЕ ПРАПУСЦІЦЕ!

# Мінск Іосіфа Лангбарда

## *Так называецца выстава, што адкрылася ў сталічнай Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага*




Страшна падумаць, якім быў бы наш Мінск, не атрымай у 1930 годзе заказ на будаванне Дома ўрада 48-гадовы архітэктар з тагачаснага Ленінграда Іосіф Лангбард! Магчыма, замест шыкоўнага будынка, не падуладнага часу і эпохам, паўстала б нешта такое, што сёння няўзгабна нагрувасцілася каля цырка? Або, не маючы нават намёку на архітэктурную грацыю, распасцерлася на Нямізе?

Разумею-разумею: у той нясыты і суровы час існавалі, як ні парадаксальна, творчыя конкурсы, здаровая канкурэнцыя, строгі адбор праектаў! І перамагалі, як ні дзіўна, не горшыя, а лепшыя. Але ж, пагадзіцеся, што заўсёды магло тады здарыцца, як здараецца ў часы нашы – сучасныя і быццам бы перадавыя...

Так думала я, прыйшоўшы на выставу «Мінск Іосіфа Лангбарда», якая адкрылася 22 лютага ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага і прысвечана 135-годдзю з дня нараджэння заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, доктара архітэктуры, выбітнага горадабудаўніка Іосіфа Рыгоравіча Лангбарда, а паралельна – будучаму 950-годдзю Мінска.

Зразумела, на такой выставе – а арганізавана яна па ініцыятыве Беларускага дзяржаўнага архіва навукова-тэхнічнай дакументацыі сумесна з Прэзідэнцкай бібліятэкай Рэспублікі Беларусь – не маглі не быць згаданы лепшыя працы геніяльнага дойліда: Оперны тэатр, Дом афіцэраў, галоўны корпус Акадэміі навук. Тым больш што каму, як не архіву, сам лёс наканаваў дэманстраваць шырокай публіцы рэдкія здымкі знакавых аб'ектаў у іх цяперашнім выглядзе, вядомых кожнаму мінчуку. Але не кожны гараджанін памятае альбо ведае, як яны ствараліся. А ствараліся яны лапатай і кельняй, сякерай і простымі чалавечымі рукамі, таму што пад'ёмных кранаў у тыя далёкія гады ў нашай сталіцы не было.

Тым што дзякуй Прэзідэнцкай бібліятэцы за выдатную ідэю – далікатна нагадаць пра гэты стваральны подзвіг беларусаў, прапанаваўшы для экспанавання дзіўныя артэфакты даваеннай эпохі: страхавы поліс будаўніка, які працаваў на рызыкоўнай вышыні, нажоўка, цвікі... Ля стэндаў з гэтымі прадметамі людзі захрасалі гэтак жа доўга, як каля сямейных фатаграфій легендарнага архітэктара з прыгажуняй-жонкай ці поруч акварэльных накідаў пасляваеннага Мінска, зробленых адразу пасля вызвалення горада яго вучнем і паплечнікам Сяргеем Святліцкім, які ўваходзіў у ўрадавую камісію па аднаўленні гарадоў Беларусі.

А яшчэ ўвазе наведвальнікаў прапанаваны прадметы ваеннай эпохі, калі Мінск быў акупаваны немцамі: пачкі з-пад цыгарэт і запалак, бляшанкі з-пад заграничных кансерваў, бутэлькі, флаконы ад касметыкі і пузыркі ад лекаў... Тое, што яны былі знойдзены на гарышчы Дома ўрада (!!!) падчас рамонту будынка, унесла дадатковую нотку загадкавасці і гістарычнага каларыту ў характар экспазіцыі. І, вядома ж, дадало цікавасці публікі да яе.

Бо не сакрэт, які ажыятаж выклікала нядаўняя публікацыя ў інтэрнэце выкладзеных замежнымі карыстальнікамі архіўных фатаграфій, зробленых немцамі ў Мінску падчас вайны, – у тым ліку Дома ўрада, у якім акупанты спалі прама на падлозе пад гігантскім барэльефам Сталіна...

Запрошаныя на выставу ганаровыя госці: дэкан архітэктурнага факультэта БНТУ Армен Сардараў, заслужаны архітэктар Беларусі Юрый Градаў, член праўлення Беларускага саюза архітэктараў Міхаіл Гаўхфельд і іншыя вядомыя горадабудаўнікі аднадушна падкрэслівалі пазачасавасць і актуальнасць архітэктурных шэдэўраў Лангбарда, яго наватарскую смеласць, якая вызначаецца не толькі ў творчых рашэннях, але і ў зносінах з тагачаснымі беларускімі чыноўнікамі, а таксама разуменне значнасці для нашчадкаў сваіх аб'ектаў.

Мабыць, ад таго, што таленавіты архітэктар ведаў сабе цану і дэманстраваў асабістую годнасць, у выніку і паплаціўся... На жаль, не ўсё з задуманага пасля вайны яму ўдалося ўвасобіць у Мінску, куды ён рэгулярна матаўся цягнікамі з Ленінграда на Няве. У прыватнасці, падрыхтаваны ў 1948 годзе конкурсны праект забудовы Цэнтральнай, а цяпер Кастрычніцкай, плошчы, макет якога таксама выстаўлены на выставе.

Увогуле, што апісваць – кожны, хто жадае больш даведацца пра гісторыю свайго горада, можа пайсці ў галерэю Савіцкага і ўбачыць цікавыя экспанаты на свае вочы. Выстава працягнецца да 2 красавіка.

Людміла СЯЛІЦКАЯ.

СПОРТИВНАЯ СЕМЬЯ

# БЬОРНДАЛЕН + ДОМРАЧЕВА: любовь-загадка в биатлоне

*С 9 по 19 февраля 2017 года в Австрии проходил чемпионат мира по биатлону. В нем принимали участие Дарья Домрачева и Уле-Эйнар Бьорндален. Роман белорусской биатлонистки и норвежского спортсмена продолжался несколько лет. В октябре 2016 года у пары родилась дочь Ксения.*



## Начало

Бьорндален и Домрачева, даже перестав хранить общий секрет, все еще не рассказали ни об обстоятельствах сближения, ни хотя бы о примерных датах. Обычно и то, и другое парам вспоминать приятно.

Единственная конкретная дата – 4 октября 2012 года: норвежец сообщил о разводе с бывшей итальянской биатлонисткой Натали Сантер. Они сыграли свадьбу в 2006-м, до этого еще восемь лет прожив вместе. Детей у Бьорндалена и Сантер не было.

Разрыв удобнее всего объяснять спортивным фанатизмом норвежца – будто биатлон вытеснил из его жизни все остальное. Но в своем отношении к тренировкам Бьорндален не менялся десятилетиями – и эта преданность не помешала ему с Сантер пробыть вместе много лет.

Одна из популярных версий подразумевает близкое знакомство Бьорндалена и Домрачевой летом 2012-го на сборе в Обертиллиахе (Австрия).

## Игра в прятки

Если в следующие полтора года отношения норвежца и белоруски как-то развивались, то пара их здорово скрывала. За все это время Домрачева лишь раз – через собственный сайт – лениво отмахнулась от повторяющихся вопросов:

*«Официальной информацией о моей личной жизни будет только сообщение о моем замужестве. Все остальное – слухи, которые не вижу смысла комментировать».*

## Что говорили о Домрачевой и Бьорндалене

Быстрее других раскололся лучший биатлонист мира Мартен Фуркад:

*«Я в хороших отношениях с Домрачевой, но, понятно, не в таких близких, как Бьорндален».*

Главный шоумен и рок-н-рольщик биатлона Бьорн Ферри отстал от француза на целый год. В нашпигованной мощными байками, залитой алкоголем и пропахшей куревом книге Ferry Tales швед непринужденно сдал всех:

*«Батя был прав в тот раз в русской Тюмени два года назад, когда подумал, что они пара. Они пара сейчас. Не то что они афишируют отношения. Но это заметно».*

Антон Шипулин дождался официального сообщения от пары и рассказал, как в биатлоне берегут чужие тайны:

*«Мы уже больше года знали об их отношениях. Дарья и Уле-Эйнар старались их не афишировать, поэтому об этом мало кто говорил».*

## Свадьба

В апреле 2016-го Бьорндален на специальной пресс-конференции сообщил, что они с Домрачевой станут родителями. По сути, это было вообще первое официальное подтверждение их отношений.

Свадьбу сыграли в середине июля – совсем непублично, даже не афишируя место. Бьорндален выложил в «Фэйсбуке» фото с подписью «Какой прекрасный день» на трех языках: английском, норвежском и русском. Автор снимка – известный норвежский фотограф Мортен Крогвольд.

## Где они будут жить?

Домрачева несколько лет строит дом – по задумке, здание должно напоминать океанский лайнер. Работы в деревне Лапоровичи (на северном берегу Заславского водохранилища – оно же Минское море) в Беларуси.

Это элитные места, участок рядом с водой обходится в несколько сотен тысяч долларов. Еще в 2011-м Домрачевой выделили здесь 20 соток – за бронзу на Играх в Ванкувере.

В округе выросли дома футболиста Александра Глеба, футбольного тренера Виктора Гончаренко, бывшего тренера Домрачевой в сборной Андриана Цыбульского и другого биатлониста, привезшего медаль из Ванкувера, – Сергея Новикова. Кстати, тогда Новиков с Бьорндаленом показали одинаковое время в индивидуальной гонке и получили по серебру.

После Игр в Сочи, где Домрачева завоевала три золота, ей в аренду на 99 лет выделили еще 80 соток, прилегающих к первому участку. Местные говорят: норвежец регулярно выезжает на стройку, чтобы контролировать ход работ. Сами строители утверждают, что даже Домрачева заглядывает сюда редко, а Бьорндалена вообще не бывало.

И прошлым летом, и в начале этой осени норвежец выбирался на плановые сборы в Раубичи, да и вообще Беларусь ему нравится:

*«Я могу есть почти все из белорусской кухни. Люблю и белорусское молоко. Что мне еще нравится в Минске, так это чистота. У меня в голове не укладывается, как это возможно. Он по этому показателю на втором месте среди всех городов, где я был. Чище только в Монако».*

Вряд ли «лайнер» на берегу Минского моря станет единственным домом пары. С 2002 года Бьорндален проживает в Обертиллиахе. Через пару недель после свадьбы регистрационную форму этого местечка заполнила и Домрачева.

## Ребенок

1 октября у Бьорндалена и Домрачевой родилась дочь Ксения. Бьорндален присутствовал при родах, два дня находился рядом с женой.

*«Впервые в жизни Бьорндалена биатлон не будет стоять на первом месте. Мне кажется, что это хорошо для него»,* – другой норвежский супербиатлонист Эмиль Свенсен проговорил то, о чем думают примерно все.

Бьорндален пообещал прибавить во владении русским – он собирается учить язык вместе с дочерью.

Менее чем через месяц после рождения ребенка Дарья Домрачева уже возобновила тренировки.

В январе 2017 года Дарья Домрачева вернулась в большой биатлон. Возвращение не получилось триумфальным. Как и предполагала сама спортсменка, это была проба сил. Все же перерыв в карьере был серьезным – год и девять месяцев. Да и вернулась Дарья другим человеком – женой и матерью.

Спринтерская гонка 6 января на четвертом этапе Кубка мира в немецком Оберхофе принесла Дарье Домрачевой только 37-е место. Трехкратная олимпийская чемпионка допустила два промаха – по одному на каждой стрельбе – и проиграла победительнице Габриэле Коукаловой чуть больше 2 минут. По скорости Домрачева также не была похожа на привычную себя – только 15-я.

**P.S.** *Дарья Домрачева на чемпионате мира в Австрии в гонке преследования завоевала серебряную медаль. Возвращение состоялось!*

НА ЗАМЕТКУ

# Великий пост: что и когда можно кушать

В этом году Великий пост у православных начался 27 февраля. Длиться он будет вплоть до 15 апреля.

Великий пост – это путь к Светлому празднику Пасхи, через который человеку верующему необходимо пройти, держа себя в строгости. Запрет накладывается не только на употребление пищи, но также запрещается проводить это время в веселье и утехах.

Что же касается трапезы, то в пост существуют некоторые правила. Исключаются мясные и молочные продукты (масло, сыр, творог, молоко), яйца, то есть все продукты животного происхождения. В понедельник, среду и пятницу пища употребляется в холодном виде, без растительного масла. По вторникам и пятницам разрешается горячая пища без масла. По субботам и воскресеньям допускается добавлять растительное масло в пищу, также разрешается употреблять виноградное вино (кроме субботы Страстной седмицы).

В Страстную пятницу (это последняя пятница Великого поста) стоит воздержаться от пищи вообще. В субботу многие соблюдающие пост также воздерживаются от пищи до наступления Пасхи.

Основные продукты, разрешенные в пост:

– хлеб черный, злаковые хлебцы;

– крупы (овсяная, гречневая, рисовая, кукурузная, пшеничная, ячневая);

– соленые и маринованные овощи, варенье из ягод и фруктов;

– грибы различного приготовления;

– бобовые (фасоль, чечевица, горох);

– сухофрукты, орехи, мед;

– овощи по сезону (картофель, свекла, морковь, лук, капуста, редька и др.);

– фрукты по сезону (яблоки, бананы, гранат, апельсины и др.).

Рыбу разрешено употреблять два раза за весь пост: в праздник Благовещения (7 апреля) и Вербное воскресенье (9 апреля).

**Календарь питания**

| Седмицы | Пн. | Вт. | Ср. | Чт. | Пт. | Сб. | Вскр. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | голодание | хлеб, вода | сырая без масла | сырая без масла | вареная без масла | вареная с маслом, вино | вареная с маслом, вино |
| 2. | сырая без масла | вареная без масла | сырая без масла | вареная без масла | сырая без масла | вареная с маслом, вино | вареная с маслом, вино |
| 3. | сырая без масла | вареная без масла | сырая без масла | вареная без масла | сырая без масла | вареная с маслом, вино | вареная с маслом, вино |
| 4. | сырая без масла | вареная без масла | сырая без масла | вареная без масла | сырая без масла | вареная с маслом, вино | вареная с маслом, вино |
| 5. | сырая без масла | вареная без масла | сырая без масла | вареная с маслом | сырая без масла | вареная с маслом, вино | вареная с маслом, вино |
| 6. | сырая без масла | вареная без масла | сырая без масла | вареная без масла | сырая без масла | вареная с маслом, вино, икра | рыба |
| Страстная | сырая без масла | | | вареная с маслом, вино | голодание | сырая без масла, вино | |

КРЫЖАВАНКА

# «Мілагучная, шчырая, мілая мова»

**Па гарызанталі:** 3.“Любіце кнігу, бо яна ... ведаў і навукі, лекі для душы” (Ф.Скарына). 6.Паляўнічы-прафесіянал. 7.“... для мяне – Каліноўскі, Скарына,//Багушэвіч, Купала і сотня такіх,//Каго гора-бяда не скарыла” – з верша Я.Золака “Мая Беларусь”. 11.Каштоўны камень чырвонага колеру. 12.Духмянасць. 13. ... – не знявага (прык.). 14.“Падымем вышэй, як штандар,//Багушэвіча слова жывое//І Купалавай спадчыны ...” – з верша М.Маляўкі “Адраджэнне”. 15.Грунт пад вадой вадаёма. 17.“У прытчах затоена мудрасць, як ... у каштоўным камяні, як золата ў зямлі і ядро ў арэху” (Ф.Скарына). 18.Мера для чаго-небудзь сыпучага. 20.Гранічная норма. 21.“Як ... ў царкве велікодная,//Яно ўрачыста пяе.//Прыроднае, моцнае, роднае//Жыве, паліць вусны мае” – з верша Р.Крушыны “О, слова салодка-хмялёвае”. 23.“Бяссмертнае ..., ты, роднае ... !// Ты крыўды, няпраўды змагло” – з верша Я.Купалы “Роднае ...”. 27.“О матчына мова ! ... вясна!//Ніколі ніхто мне цябе не заменіць” – з верша А.Бачылы “Матчына мова”. 29.“Мой чароўны беларускі ...,// Бацькаўшчына светлая мая!” – з верша Ул.Караткевіча “Бацькаўшчына”. 30.Калючы куст. 31.“Наша мова – бярозавік весні,//... жаўруковае песні” – з верша Я.Золака “Наша мова”.

**Па вертыкалі:** 1.“Дык шануй, ..., сваю мову –//Гэта скарб нам на вечныя годы” – з верша А.Гаруна “Ты, мой брат, каго завуць беларусам...”. 11 сакавіка – 130 год з дня яго нараджэння. 2.“Кажуць, мова мая аджывае//... свой ціхі: ёй знікнуць пара.//Для мяне яна вечна жывая,//Як раса, як сляза, як зара” – з верша П.Панчанкі “Родная мова”. 3.Краска, кветка (паэт.). 4.“Кожны ... мае хаця б адзін геніяльны твор, і гэты твор – мова” (А.Разанаў). 5.Музычны смычковы інструмент. 8.“... падымае пытанне і на пытанне шукае адказу” (Ф.Скарына). 9.“... вучыцельнае” – кніга друкароў і асветнікаў І.Фёдарава і П.Мсціслаўца, якая была выдадзена ў 1575 годзе. 10.“Гаварыце ж на мове, што чулі ад маці.//Беларусь – ... нашая – перад усім!” – з верша Л.Геніюш “Йду па Менску, нідзе сваёй мовы не чую”. 16.“Мая спадчына, гонар і мараў ...,//Мілагучная, шчырая, добрая мова” – з верша М.Лешчуна “Родная мова”. 19.“..., доктар лекарскіх навук,//У доўгай вопратцы на вежы сочыць зоры” – з верша М.Багдановіча “Безнадзейнасць”. 22.“Такое ласкавае, цёплае, чыстае,// Як ..., агністае,//Як Нёман, празрыстае” – з верша Д.Бічэль-Загнетавай “Роднае слова”. 24.Старажытнаскандынаўскае народнае эпічнае сказанне. 25.“Ты, мова, ... Купалы зберагла//І Коласаву праўду падарыла” – з верша В.Івашына “Мова родная”. 26.Ранні ... родзіць пшанічку, а позні – мятлічку (прык.). 28.“Збірайце добрыя думкі ў сэрцы сваім, як пчала ...” (Еўфрасіння Полацкая).



## Адказы на крыжаванку

**Па гарызанталі:** 3.Крыніца. 6.Егер. 7.Беларусь. 11.Рубін. 12.Водар. 13.Увага. 14.Дар. 15.Дно. 17.Моц. 18.Мех. 20.Ліміт. 21.Песня. 23.Слова. 27.Маленства. 29.Край. 30.Цёрн. 31.Аксаміт.

**Па вертыкалі:** 1.Беларус. 2.Век. 3.Квет. 4.Народ. 5.Альт. 8 Філасофія. 9.Евангелле. 10.Маці. 16.Калыска. 19.Скарына. 22.Сонца. 24.Сага. 25.Свет. 26.Пар. 28.Мёд.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ. г.Дзяржынск.**

УЛЫБНИТЕСЬ...

Попросила мужа сходить в магазин, дала ему шпаргалку, что нужно купить: 1.батон, 2.колбаса, 3.молоко, 4.зубная паста, 5.туалетная бумага, 6.пиво.

Когда он пришел из магазина, я заглянула в пакеты. Там оказался один батон, две палки колбасы, три пакета молока, четыре тюбика пасты, пять рулонов туалетной бумаги и шесть бутылок пива. Придраться не к чему, но следующий раз список необходимых покупок начну с пива.



Падпісныя індэксы:
63222 – для індывідуальных падпісчыкаў,
632222 – для прадпрыемстваў і арганізацый.

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ

Пакольні ў рэдакцыі няма магчымасці рэцэнзаваць і вяртаць нявыкарыстаныя матэрыялы, яна пакідае права ўступаць у перапіску за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні дзяржаўнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 27.02.2017 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 25 020 экз. Заказ № 470.



Адрас рэдакцыі: 220030 Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 328-68-71.
nvonlineinfo@gmail.com
http://www.nv-online.info